# Першы выпуск малодшых камандзіраў адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі

23 мая ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае першаму выпуску ваеннай кафедры. Гэтая знамянальная падзея стала важным жыццёвым этапам не толькі для 121 выпускніка, але і для ўсёй галіны сувязі.
Віншаванні і сказаныя на дарогу словы прышлых вайсковых сувязістам адрасавалі міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Пятровіч Папкоў і дырэктар ААТ «Агат-сістэмы кіравання», генерал-маёр Генадзь Станіслававіч Казакоў.

- Спецыялісты па эксплуатацыі лічбавых сродкаў сувязі заўсёды былі запатрабаваныя ва Узброеных Сілах і іншых сілавых структурах Рэспублікі Беларусь. Вы атрымалі спецыяльнасці, якія патрэбны як у мірны, так і ў ваенны час, - адзначыў С.П. Папкоў і пажадаў выпускнікам ў далейшым знайсці сябе на прафесійным шляху і ў поўнай меры рэалізаваць свой патэнцыял.

Выпускнікі, у сваю чаргу, выказалі словы шчырай падзякі выкладчыкам, якія на працягу ўсяго навучання былі побач, дзяліліся сваімі ведамі, вопытам і жыццёвай мудрасцю, давалі каштоўныя парады, падтрымлівалі і дапамагалі.

На мерапрыемстве прысутнічалі начальнік сувязі Узброеных Сіл - начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Алег Рыгоравіч Мішчанка, начальнік упраўлення ваеннай адукацыі Узброеных Сіл, палкоўнік Ігар Пятровіч Слуцкі, рэктар УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі» Андрэй Алегавіч Зяневіч, начальнік ваеннай кафедры УА «БГАС», палкоўнік Ігар Алегавіч Мачыха і інш.

У завяршэнні лепшым выпускнікам былі ўручаны граматы ад службовых асоб Мінабароны, а таксама адзначаны афіцэры-выкладчыкі ваеннай кафедры, начальнік ваеннай кафедры, палкоўнік Мачыха І.В. узнагароджаны нагрудным знакам «Пачэсны ваенны сувязіст».

Мерапрыемства праходзіла каля мемарыяльнага знака воінам-сувязістам, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, размешчаным у двары Акадэміі сувязі. У гады Вялікай Айчыннай вайны воіны-сувязісты, пераадольваючы адлегласці, пракладалі кабелі сувязі, рызыкуючы сваім жыццём. Дзякуючы дакладнай і своечасова атрыманай інфармацыі аб размяшчэнні праціўніка былі выйграныя буйныя бітвы.

*ДАВЕДАЧНА*
*Ваенная кафедра ва ўстанове адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі» сфарміравана 31 студзеня 2017 года і з'яўляецца структурным падраздзяленнем акадэміі сувязі, прызначана для навучання грамадзян мужчынскага полу (навучэнцаў і студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі) па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і афіцэраў запасу.*
*На кафедры ажыццяўляецца падрыхтоўка малодшых камандзіраў па ваенна-уліковых спецыяльнасцях: "Начальнік апаратнай" (аўтаматычныя тэлефонныя станцыі), "Начальнік апаратнай" (апаратныя правадной сувязі), "Начальнік радыёрэлейнай станцыі" (шматканальнай), "Начальнік радыёрэлейнай станцыі" (малоканальной).*

*Паступіць і вучыцца на ваеннай кафедры могуць юнакі (навучэнцы спецыяльнасцяў "Сеткі тэлекамунікацый", "Сістэмы радыёсувязі, радыёвяшчання і тэлебачання" і студэнты спецыяльнасцяў "інфакамунікацыйнай сістэмы", "інфакамунікацыйных тэхналогій", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Маркетынг"). Тэрмін навучання складае 1,5 года.*
*Па заканчэнні навучання выпускнікі здаюць выпускны экзамен, прызываюцца на тэрміновую ваенную службу тэрмінам на 6 месяцаў, пры жаданні, замест тэрміновай ваеннай службы заключаюць кантракт у вайсковых частках тэрмінам на два гады і праходзяць ваенную службу на пасадах прапаршчыкаў.*

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/23-05-2018-3135*